рыхтуюць работнікаў культурна-адпачынкавай сферы і рэкрэацыйных работнікаў, спецкурсаў па методыцы падрыхтоўкі метадычных, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў і матэрыялаў па абагульненні вопыту работы;

— у стварэнні рэспубліканскай карпаратыўнай аўтаматызаванай сеткі, якая б аб'ядноўвала АНМЦ рэспублікі.

**Ю.М.Бяспалы,**
*суіскальнік кафедры сацыялогіі і культуразнаўства*

## РОЛЯ МЕТАДАЎ У НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

Важным для кожнага даследчыка з'яўляецца вызначэнне галоўнага кірунку даследавання. У навуковай літаратуры шмат увагі надаецца значэнню метадалогіі і метадаў у даследаванні. Але не ўсе метады разглядаюцца з належнай увагай. Некаторыя навукоўцы лічаць, што "галоўнай мэтай метадалогіі навукі з'яўляецца вывучэнне тых сродкаў, метадаў і прыёмаў даследавання, з дапамогай якіх дасягаюцца новыя веды" (5, с. 14). Адносна такога выказвання можна заўважыць, што даследчыка павінен цікавіць не толькі канчатковы вынік, але і сутнасць яго дасягнення. Спецыфіка і характар пазнавальнай дзейнасці прадугледжваюць вывучэнне станаўлення, функцыянавання, суіснавання і ўзаемадзеяння эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў з мэтай найбольш поўнага і аб'ектыўнага раскрыцця тэмы.

Як вядома, у савецкі перыяд краевугольным каменем кожнай працы ў галіне гуманітарных навук прызнавалася марксісцка-ленінская тэорыя. А.М.Гульпе, напрыклад, пісаў аб гэтым дастаткова выразна: «Работа У.І.Леніна "Дзяржава і рэвалюцыя" самым карэнным чынам паўплывала на ўвесь ход успрымання юрыдычнай навукай марксісцка-ленінскай канцэпцыі як дзяржавы, так і права» (3, с. 13).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заснавальнікі савецкай юрыдычнай навукі прызнавалі асобую ролю грамадскіх адносін, якія рэгулююцца правам. Аднак у адрозненне ад юрыстаў папярэдняга перыяду, якія зыходзілі "з неабходнасці даследавання сацыяльнага стану і адпаведных яму законаў» (1, с. 192), савецкія вучоныя лічылі, што «закон і сістэма права ў цэлым павінны адлюстроўваць новую класавую сутнасць» (3, с. 16). Тым самым перавага аддавалася прынцыпу матэрыялістычнага падыходу да крыніц права. Ён цесна звязаны з вучэннем аб змене грамадска-эканамічных фармацый, заканамернасці і незваротнасці гэтага працэсу. У кожным з гістарычных перыядаў з пазіцый класавага падыходу аналізаваліся ўзнікненне, стан і развіццё юрыдычнай навукі, у тым ліку і цывілістыкі.

Перамены, якія адбыліся ў грамадстве ў канцы XX ст., вельмі востра паставілі пытанне аб метадалогіі юрыдычнай навукі і разам з тым далі магчымасць яе прадстаўнікам вывучаць багаты вопыт расійскіх юрыстаў XIX ст., аналізаваць дасягненні еўрапейскай і сусветнай юрыспрудэнцыі. Гэта садзейнічала збліжэнню з сусветнай юрыдычнай навукай і практыкай. Месца марксісцка-ленінскай метадалогіі з яе прынцыпамі партыйнасці і класавай арыентаванасці занялі іншыя. Нам падаецца, што вызначэнне метадалогіі пры вывучэнні гэтых прававых прынцыпаў мае выключна важнае значэнне.

У канцы 80-х гг. XX ст. з'яўляюцца даследаванні па праблеме генезісу права. Яно разглядаецца перш за ўсё як працэс «аддзялення выражаных у пісьмовай форме праваўстаральных рашэнняў заканадаўцы ад прымесей маральных, рэлігійных нормаў» (4, с. 8). Гэты кірунак у вызначэнні важнейшай праблемы вытокаў узнікнення першых заканадаўчых актаў збліжаецца з пазіцыяй цывілістаў XIX ст. Адзін з вядомых тэарэтыкаў юрыдычнай навукі пісаў, што, «каб пазбегнуць блытаніны, будзе больш правільным вычленіць асновы і мэты юрыдычных нормаў са сферы матываў і пачуццяў: рэлігійных вераванняў, этычных прынцыпаў, існуючых звычаяў і маральных нормаў» (1, с. 81).

На наш погляд, генезіс такіх прынцыпаў, як справядлівасць, разумнасць, добрасумленнасць, надзвычай набліжаны да маральных і этычных поглядаў пэўнага соцыуму. Метадалагічнай асновай даследавання можна лічыць прызнанне выключнай ролі адзначаных прынцыпаў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і, безумоўна, у грамадзянска-прававых адносінах. Менавіта ў іх выразна адлюстроўваюцца ўзровень прававой культуры грамадства, агульны кірунак і дынаміка яго развіцця. Прынцыпы права, іх ужыванне ў судовай практыцы можна вывучаць, на наш погляд, як сацыяльна-культурны феномен, які характарызуе ў значнай ступені цывілізацыйны ўзровень канкрэтнага соцыуму, асабліва калі разглядаць суадносіны агульных прававых нормаў і падзаконных нарматыўных актаў розных ведамстваў і мясцовых дзяржаўных органаў.

Методыка даследавання названых прынцыпаў павінна грунтавацца на філасофскіх, агульнанавуковых і спецыяльных метадах. Сярод апошніх у адпаведнасці з кірункам нашых даследаванняў нас цікавіць вылучэнне гісторыка-прававога, які ўключае, у сваю чаргу, генетычны, сістэмны, параўнальны і тыпалагічны метады. Іх ужыванне дазволіць правесці комплекснае даследаванне генезісу і эвалюцыі прынцыпаў права.

Аднак вызначальнае месца ў метадалогіі даследавання генезісу права займаюць філасофскія метады (4). І тут дарэчы заўважыць, што ні ў якім разе нельга ігнараваць аксіялогію, таму што прынцыпы права цесна звязаны з прыродай агульначалавечых каштоўнасцей. Па гэтай прычыне каштоўнасны падыход мае важную ролю ў даследаванні прынцыпаў права. Не меншая роля належыць і нацыянальна-псіхалагічнаму падыходу.

Што тычыцца агульнанавуковых метадаў, то тут, безумоўна, у першую чаргу вылучаюцца аналіз і сінтэз, а таксама метад ад абстрактнага да канкрэтнага. Пакуль што навукоўцы недастаткова выкарыстоўваюць метады сістэмна-структурнага аналізу, мадэлявання і некаторыя іншыя (2, с. 23), а менавіта яны ў любым даследаванні дазваляюць дасягнуць навуковай абгрунтаванасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне філасофскіх, агульнанавуковых і спецыяльных метадаў у юрыдычным даследаванні садзейнічае ўдасканальванню нарматыўна-прававой структуры грамадства, верхавенству закона, маральна-гуманістычнаму прадвызначэнню права, яго цеснай сувязі з прававой культурай соцыуму.


1. *Васьковский Е.В.* Цивилистическая методология.— Б.м., б.г.— 398 с.

2. *Витушко В.* Курс гражданского права: общая часть: Науч.-практ. пособие.— Мн., 2001.— Т. 1.— 414 с.

3. *Гульпе А.Н.* Формирование методологии советской правовой науки (1917—1925 гг.): Автореф. дис.... канд. юр. наук / Ин-т государства и права АН СССР. — М., 1986. — 16 с.

4. *Казаков В.Б.* Генезис права: вопросы теории: Автореф. дис.... канд. юр. наук / ЛГУ. — Л., 1988.— 16 с.

5. *Садовский М.Н.* О философско-методологическом анализе научного прогресса // Философские науки. — 1981. — №5. — С. 11—15.



**А.Я.Вайтусёнак,**
*суіскальнік кафедры харавога мастацтва*


## ВЫТОКІ І МАСТАЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ СЛАВЯНСКАЙ ДУХОЎНАЙ МУЗЫКІ

Духоўная музыка — гэта музыка рэлігійнага зместу, якая выконваецца ў храме ці ў канцэртнай зале. У аснове праваслаўнай духоўнай музыкі ляжыць знаменны распеў; аснову каталіцкай музыкі складае грыгарыянскі харал; для лютэранскай музыкі асновай з'яўляецца пратэстанцкі харал.

Музычная супольнасць славян — гэта не маналітная народная музычная культура, а музыка ў дастатковай меры дыферэнцыраваная, у якой знайшлі адбітак традыцыі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ